И здесь, несомненно, первостепенную роль играет философия как учение о духовно-нравственной сущности человека, его извечном стремлении к правде и справедливости, доверию и солидарности, что и заключает в себе надежду на возможность достижения гуманистической модели будущего.

1. *Бжезинский, З.* Выбор. Мировое господство, или глобальное лидерство / З. Бжезинский ; пер. с англ. – М., 2004. – С. 287.

2. *Лапин, Н. И.* Фундаментальные ценности цивилизационного выбора в XXI столетии. Часть I. Человеческая цивилизация перед выбором конфигурации фундаментальных ценностей / Н. И. Лапин // Вопросы философии. – 2015. – № 4.

3. *Лекторский, В. А.* «Вопросы философии» в моей жизни / В. А. Лекторский // Вопросы философии. – 2017. – № 7.

4. *Насынбаев, А. Н.* Становление глобальной этики и взаимопонимания / А. Н. Насынбаев // Вопросы философии. – 2017. – № 8.

5. *Фукуяма, Ф.* Наше постчеловеческое будущее: последствия биотехнологической революции / Ф. Фукуяма. – М. : АСТ : Люкс, 2004. – 352 с.

6. *Черникова, И. В.* Сохранение природы человека как глобальная проблема современности / И. В. Черникова // Вопросы философии. – 2016. – № 9.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## МУЗЫЧНЫЯ АЛЮЗІІ І ЦЫТАТЫ Ў ТВОРАХ ПОЛЬСКІХ КАМПАЗІТАРАЎ XX – пачатку XXI ст. (на матэрыяле песнаспеву «Багародзіца»)

***Т. Ю. Трафімчук,***
*кандыдат мастацтвазнаўства,*
*старшы выкладчык кафедры сацыяльнай працы*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна,*

Сярэдневяковы песнаспеў «Багародзіца» ўяўляе сабой адзін з найвядомых старэйшых помнікаў музычнай культуры Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага, які захаваўся да сённяшняга часу. Для многіх польскіх кампазітараў XX – пачатку XXI ст. ён стаў каштоўнай крыніцай мастацкіх інспірацый сярэдневяковай (у шырокім сэнсе) тэмы. Важна, што прычынай таму з’яўляецца не толькі ўнікальнасць твору як выбітнага ўзору гістарычна-культурнай спадчыны, але і багаты змястоўна-сэнсавы «арэол» песнаспеву.

Першая вядомая запісаная версія «Багародзіцы» датавана 1407–1408 гг. (табл. 1). Час стварэння дакладна не вызначаны.

Рукапіс 1619 г. BJ [3]        Рукапіс 1619 г. BJ [8]



*Мал. 1.* Выгляд захаванага запісу «Багародзіцы» ад 1407–1408 гг.

Даследчык Іеронім Фейхт на падставе дэталёвага музычна-тэксталагічнага аналізу «з пэўнай асцярожнасцю» сцвярджае, што «мелодыя “Багародзіцы” ў X–XI ст. узнікнуць не магла, бо вельмі ясна і шматліка прысутнічаюць у ёй сляды матывікі і меладыйных абаротаў XII–XIII ст.» [4, с. 149]. Пры гэтым, паводле слоў Здзіслава Яхімецкага, «у цэлым як мастацкі твор “Багародзіца” з’яўляецца песняй арыгінальнай, нягледзячы на відавочную роднасць яе матываў са шматлікімі матывамі сярэдневяковай манодыі» [пав. 4, с. 149].




*Мал. 2.* «Багародзіца» [2]

Аўтар песнаспеву невядомы, але даследчыкі не выключаюць, што паэт і музыкант маглі быць адной і той жа асобай. Бясспрэчным з’яўляецца меркаванне аб высокім узроўні музычнага таленту кампазітара – трубадура або (што верагодней) кіраўніка школы спеваў, бо «толькі прафесійны музыкант, а ні аматар, мог стварыць такі дасканалы твор» [4, с. 168–169].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Асаблівасцю «Багародзіцы» з’яўлялася шырокае «поле» яе гучання і функцыянавання, таму і вызначэнні жанру твора часта розныя. «Нагадаем, – піша даследчыца Багуміла Міка, – што “Багародзіца” – гэта песня, якая ўяўляе род малітвы, мальбы да Найсвяцейшай Панны Марыі. Адначасова гэта рыцарская песня з XIII ст., якая, паміж іншым, выконвалася падчас бітвы пад Грунвальдам у 1410 г.» [6, с. 209]. «Patrium carmen, як яшчэ называлі “Багародзіцу”, цесна зраслася з гісторыяй Польшы, – заўважае Эва Обніска. – Яна гучала і пры каранацыях каралёў, і пры выдачы важнейшых дзяржаўных дэкрэтаў» [пав. 6, с. 209]. Значнасць песнаспеву падкрэслівае і Іеронім Фейхт, калі даводзіць, што «кампазіцыя гэта … выконвала ў даўніх стагоддзях, паводле традыцыі, ролю нацыянальнага гімна» [4, с. 130].

Істотна і іншае: «Багародзіцу» не толькі шырока ведалі, але і адносіліся да песнаспеву вельмі паважліва, нават любоўна. Пацверджаннем таму можа быць прадмова да аднога з пазнейшых (1916) выданняў твору, дзе аўтар піша: «Спеў гэты, як светлая ніць нябеснага ззяння, абвівае жыццё Польшы, як поўны велічы і святасці прыпеў кожную хвіліну адгукаецца ў магутнай песні мінуўшчыны. З тым гімнам на вуснах нашыя продкі ваявалі з ворагам …, калі тым часам жанчыны, старыя, калекі і дзеці тым жа гімнам пасля Боскіх храмаў малілі Найсвятлейшую Маці Збавіцеля аб блаславенні зброі змагароў» [2, с. 3].

Вызначаныя мастацкія, культурна-гістарычныя якасці і адметнасці сярэдневяковага песнаспеву адбіліся ў творчым адчуванні, асэнсаванні і далейшым увасабленні матываў «Багародзіцы» ў музыцы польскіх кампазітараў XX – пачатак XXI ст., дзе на першы план праступаюць рэлігійна-патрыятычны, «рыцарскі» (баявы) і народна-грамадскі змястоўныя аспекты.

Адсылка да даўняга гімну можа праяўляць сябе па-рознаму. Па-першае, непасрэдна праз назву твора. Прыкладамі з’яўляюцца імша «Багародзіца» (1943) для хору і аргана Фелікса Ранчкоўскага, кантата «Багародзіца» (1975) для хору і аркестра Войцеха Кілара, а таксама аднайменная музычная ілюстрацыя да гістарычных падзей для кларнета, трамбона, фартэпіяна і віяланчэлі (2007) Ігара Янкоўскага. Другі кампазітраскі падыход – музычнае цытаванне песнаспеву, яго асобных частак,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

матываў з выкарыстаннем адпаведнага вербальнага тэксту альбо без яго. Да прыкладу, у названай вышэй араторыі кампазітар В. Кілар цалкам ужывае дзве страфы тэксту «Багародзіцы» паводле яго запісу ў «Гісторыі літаратуры незалежнай Польшчы» Ігнацыя Чарноўскага (выд. каля 1974 г.). Музычны матэрыял даўняга гімна гучыць толькі фрагментарна.




*Мал. 3.* Фрагмент з араторыі «Багародзіца» В. Кілара [5, с. 8]

Ян Маклакевіч у сваёй сімфанічнай паэме «Грунвальд» (1944)*, дзе ў вобразах сярэдневяковай бітвы ясна адгадваецца праекцыя актуальных ваенных падзей таго часу, для стварэння асобай, узнятай атмасферы твору выкарыстаў шэраг вядомых польскаму слухачу стылізацый народных спеваў, а таксама цытат, у ліку якіх фрагменты рэлігійнай вялікоднай песні «Праз Твае святое Уваскрасенне» і песнаспеву «Багародзіца». Яны ўплятаюцца ў музычную тканіну паэмы, якая стылістычна вытрымана ў традыцыях познерамантычнай плыні, і красамоўна перадаюць «выявы малітоўнага спеву войска, топату каней, ваенных сігналаў, сутыкнення ворагаў, бітвы, жалобы па загінуўшым на полі бою і славы перамозе» [8].

Шматгранная семантыка сярэдневяковага ўзору адлюстравалася і ў «Сакральнай сімфоніі» (Simfonia Sacra) (1963) Анджэя Пануфніка, прымеркаванай да святкавання юбілейнай даты распаўсюджання хрысціянства ў Польшчы. Сам аўтар падкрэліваў, што для яго «Багародзіца» – гэта песнаспеў, які «у Сярэдневякоўі спявалі не толькі вернікі ў касцёлах, як малітву да Марыі, але польскія рацары на палях бітвы» [7]. Адпаведна гераічны і рэлігійны змястоўна-вобразныя аспекты і з’явіліся

---

* Вядома, што першыя фартэпіянныя эскізы былі зроблены кампазітарам яшчэ ў 1939 г., але цяжкія ўмовы ваеннага часу адцягнулі поўнае заканчэнне твора на некалькі гадоў. Толькі ў верасні 1943 г. кампазітар прыступіў да інструментоўкі паэмы, якую скончыў праз два месяцы. Першае выкананне сачынення адбылося 30 мая 1945 г. Далей твор часта гучаў у розных гарадах Польшы і за яе межамі, дарэчы, 16 мая 1946 г. «Грунвальд» быў выкананы ў Маскве пад кіраўніцтвам Казімежа Вілкомірскага.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вядучымі ў сімфоніі, якая пранізаная інтанацыямі гімну. Прынамсі ў першай частцы твору, якую складаюць тры кантрастныя па ўнутранаму строю і гучанню «Уявы» («Wizji»), кампазітар выбудоўвае музычную (меладыйную і гарманійную) тканіну на аснове інтэрвалаў першых чатырох гукаў мелодыі «Багародзіцы» (кварта становіцца вядучай інтанацыяй ва «Уяве I», вялікая секунда – ва «Уяве II», малая секунда – ва «Уяве III»). Другая частка – «Гімн» («Hymn») – дэманструе іншы падыход аўтара да працы з першакрыніцай. Менавіта тут даўні песнаспеў з'яўляецца ў сваім поўным выглядзе і ад амаль нячутнага напачатку гучання ў партыі струнных інструментаў разгортваецца далей да магутнай, эфектнай кульмінацыі ўсёй сімфоніі ў аркестравага tutti.

Такім чынам, у творчасці польскіх кампазітараў зварот да сярэдневяковага песнаспеву «Багародзіца» становіцца і застаецца актуальным на працягу XX – пачатку XXI ст. Увасоблены ў розных жанрах, прадстаўлены ў разнастайных мастацка-стылёвых і змястоўна-вобразных іпастасях, даўні гімн, як і раней, кранае сваім узнёслым і высакародным гучаннем, яднае розныя культуры і эпохі.


*1.* Богородица (гимн) [Электронный ресурс] // Википедия. – Режим доступа : https://ru.wikipedia.org. – Дата доступа : 15.08.2017.

*2.* Bogarodzica [Ноты]. – Petrograd, 1916. – 4 s.

*3.* Bogarodzica według rękopisu Krakowskiego, podanego przez prof. A. Polińskiego. – Wyd. : Gebethner i Wolff, 1903. – 4 s.

*4. Feicht, H.* Studia nad muzyką polskiego średniowiecza / H. Feicht. – Warszawa : PWM, 1975. – 400 s.

*5. Kilar, W.* Bogurodzica / W. Kilar. – Krakow : PWM, 1978. – 24 s.

*6. Mika, B.* Pieśń Bogurodzica w funkcji cytatu w muzyce polskiej XX wieku / B. Mika // Donum Natalicum ; red. Z. Fabiańskiej. – Kraków : Muzyka Jagellonika, 2007. – S. 209–221.

*7. Pieńkowska, P.* Epopea narodowa w nuty zaklęta. Simfonia Sacra Andrzeja Panufnika [Zasób eleltroniczny] / P. Pieńkowska // Historia: poszukaj. – Tryb dostępu : http://historiaposzukaj.pl. – Data dostępu : 15.03.2017.

*8. Wacholc, M.* Jan Adam Maklakiewich. Grunwald. Poemat symfoniczny [Zasób eleltroniczny] // M. Wacholc ; PWM Edition. – Tryb dostępu : https://pwm.com.pl. – Data dostępu : 18.08.2017.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ